# РАЗВІЦЦЁ ДРОБНАТАВАРНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ Ў 1921-1924 гг.

*Л. А. Доўнар*

У 1920-е гг. стаўленне савецкай улады да прыватнай вытворчасці змянілася. Яе развіццё стала разглядвацца як важны сродак пераадолення эканамічных цяжкасцей ў краіне. Прыватныя вытворцы павінны былі забяспечыць насельніцтва таварамі шырокага ўжытку, садзейнічаць змяншэнню ўзроўня беспрацоўя і падлеткавага беспрытульніцтва. Таму ў перыяд 1921-1924 гг. былі створаны спрыяльныя умовы для функцыянавання прыватнага капіталу. У той жа час дзяржава імкнулася не дапусціць канкурэнцыі прыватных прадпрыемстваў з дзяржаўнымі. Для рэгулявання і кантроля над прыватнай вытворчасцю ў 1921 г. быў створаны Белсаматужпрам. У яго першай пастанове гаварылася:

«1. Усе заказы на вырабы беларускай прыватнай прамысловасці павінны зыходзіць толькі ад Белсаматужпрама.

2. Саматужнікі і іх аб'яднанні, прыняўшыя заказ, акрамя Белсаматужпрама пазбаўляюцца права прадаўжаць сваю дзейнасць.

3. Саматужнікам забараняецца прадаваць, а ўстановам купляць вырабы дробнай прыватнай прамысловаці» [1, л. 23].

Перыяд адноснай свабоды прадпрымальніцтва пачаўся толькі пасля ліквідацыі Белсаматужпрама, якое было здзейснена 24 жніўня 1922 г. [2, л. 5]. Уладальнікі дробнапрамысловых прадпрыемстваў атрымалі права свабодна распараджацца прадукцыяй уласнай вытворчасці.

Аслабленне адміністрацыйнага кантролю дзяржавы за прадпрыймальніцкай дзейнасцю садзейнічала павялічэнню колькасці жадаючых стварыць вытворчае прадпрыемства. Згодна з дадзенымі прамысловага перапісу ад 22 снежня 1922 г. у БССР афіцыйна працавала 4 846 прыватных прадпрыемстваў, што ў 1,8 разы больш, чым было ў 1921 г.

Сацыяльны састаў прадпрыймальнікаў быў вельмі стракаты. Умоўна яны падзяляліся на тры групы: рамеснікі, саматужнікі і прамыслоўцы. Рамеснік працаваў толькі на канкрэтнага заказчыка, без гандлёвых пасрэднікаў і наёмных рабочых. Саматужнай называлася дробнасерыйная вытворчасць на рынак праз гандлёвых пасрэднікаў, ад якіх залежылі пастаўка сыравіны і збыт гатовай прадукцыі. Саматужнік мог выкарыстоўваць працу аднаго-трох прафесійных рабочых і аднаго-трох вучняў падлеткавага ўзросту. Прамысловымі лічыліся прадпрыемствы з механізаванай вытворчасцю і наёмнымі рабочымі. Сярод прыватных вытворцаў 82,5 % лічыліся прамыслоўцамі, а 17,4 % адносіліся да саматужнікаў [3, л. 371]. Самым вялікім прамысловым прадпрыемствам была цвікарня ў Хутарской воласці Ігуменскага павета, якая належала Е. Капшецкаму, дзе меўся лакамабіль і працавала 50 наёмных рабочых [4, л. 115].

На першае месца па распаўсюджанасці выйшла гарбарная вытворчасць. У 1922 г. мелася 1 286 прыватных прадпрыемстваў гэтай спецыялізацыі, што ў чатыры разы больш, чым у 1921 г. Колькасць рабочіх павялічылася ў два, колькасць гарбарных заводаў у тры, колькасць нарыхтоўчыкаў у чатыры разы ў параўнанні з мінулагоднім паказчыкам. Дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў стала больш на 59,5 %, галоўным чынам дзякуючы сталярам. Дарэчы, у анкетах яны рэдка пісалі «сталяр», а называліся ўладальнікамі мэблявых майстэрняў. Амаль у два разы павялічылася колькасць кравецкіх майстэрняў, прычым большасць з іх былі вузкаспецыялізаванымі. На прыгожых шыльдах, намаляваных прыватнымі мастакамі, звычайна пісалася «атэлье па пашыву дамскіх сукенак» ці «майстэрня мужчынскіх касцюмаў», «белашвейня» ці «пашывачная верхняй зімовай вопраткі». Акрамя таго, у БССР значна павялічылася колькасць мылаварняў, млыноў і цагляных заводаў.

На тэрыторыі Беларусі прыватныя прадпрыемствы разнастайнай спецыялізацыі былі раўнамерна распаўсюджаны. Тут не было так званых «саматужных гнёздаў» — рэгіёнаў па вытворчасці

пэўнага віду прадукцыі, як у Ніжагародскай, Маскоўскай, Тульскай, Уладзімірскай і Пензенскай губернях Расіі.

За 1922-1923 гг. валавая прадукцыя прыватнай вытворчасці ў агульным прамысловым абароце павялічылася з 84,6 % да 85,7 %, у той час, як валавая прадукцыя дзяржаўнай прамысловасці панізілася з 14 % да 6,2 % ад агульнага абарота прамысловасці БССР. Вырабы саматужнікаў былі ў 3-4 разы танней, чым аналагічная прадукцыя дзяржаўных прадпрыемстваў. Так, пашыў нагавіц ў дзяржаўным атэлье каштаваў 1 руб. 53 к, а ў прыватнага шаўца толькі 35 к. [5, л. 316].

У беларускіх паветах, якія знаходзіліся ў складзе РСФСР, таксама адбывалася інтэнсіўнае развіццё прыватнай вытворчасці. У канцы 1922 г. тут было 6 337 прыватных прадпрыемстваў, прычым 36,7 % з іх знаходзіліся ў Магілёўскім павеце. Дамінуючай галіной з’яўлялася харчовая прамысловасць. Прыватных млыноў тут было ў 1,6 разы больш, чым у БССР, прычым чвэрць з іх былі абсталяваны паравымі, газагенератарнымі ці нафтавымі механічнымі рухавікамі.

Самым вялікім прыватным прадпрыемствам у гэтым рэгіёне была майстэрня па вырабу іголак ў Віцебску, якая належыла Э. Левінсану, дзе мелася 43 наёмных рабочых і 4 служачыя. Нярэдка адзін прадпрымальнік валодаў некалькімі прадпрыемствамі. Так, В. Н. Алебрасаў з вёскі Лугаўская Гарадоцкага павета меў гарбарны завод, дзе рабіў падэшвы для ботаў і шорную майстэрню, дзе займаўся вытворчасцю конскай вупражы [6, л. 79].

У Віцебскім павеце вялікае распаўсюджванне атрымаў ганчарны промысел, бо тут амаль не выкарыстоўваўся драўляны посуд. Апрацоўкай металаў, шавецкім і гарбарнымі промысламі ў Віцебскай і Магілёўскай губерніях было занята ў 2 разы больш прадпрымальнікаў, чым у БССР. На кожным з прыватных прамысловых прадпрыемстваў працавала ад 6 да 30 наёмных рабочых.

Цікавай асаблівасцю харчовай прамысловасці Гомельшчыны можна назваць наяўнасць там медаварняў — прадпрыемстваў па

выпрацоўцы медавухі — алкагольнага напою з мёду, хмелю, цукру і вады. Такія прадпрыемствы абсталёўваліся варачнымі катламі, брадзільнымі чанамі і фільтрамі. Палівам служылі сасновыя дровы. На медаварнях звычайна працавалі 2-3 наёмныя рабочыя. За месяц на адным прадпрыемстве атрымоўвалася ў сярэднім 392 вядры, або 2 960 літраў медавухі. Самымі знакамітымі былі медаварні братоў Крацер, якія знаходзіліся ў Гомелі на вуліцы Камсамольскай.

Такім чынам, ажыўленне прыватнай вытворчасці адбылося ўжо ў першыя гады новай эканамічнай палітыкі. На працягу 1921-1922 гг. у БССР найбольш інтэнсіўна развівалася гарбарная вытворчасць, а ў беларускіх паветах на тэрыторыі РСФСР галоўнае месца належала прадпрыемствам па вытворчасці прадуктаў харчавання. У БССР 94 % вытворчых прадпрыемстваў знаходзіліся ў прыватнай уласнасці, 5 % належылі дзяржаве і 0,8 % — кааператыўным установам. У беларускіх паветах на тэрыторыі РСФСР прыватнаўласніцкімі з’яўляіся 93,5 %, дзяржаўнымі — 6,3 %, кааператыўнымі — 1,7 % вытворчых прадпрыемстваў. Значная колькасць прыватных прадпрыемстваў знаходзілася ў Мінскім і Магілёўскім паветах. Відавочна, што прамысловасць у першыя гады НЭПа пераважна знаходзілася ў прыватнай уласнасці.

У 1923-1924 гг. канчаткова склаўся так званы прыватны сектар эканомікі, куды ўваходзілі скупшчыкі сельскагаспадарчай сыравіны, уладальнікі вытворчых прадпрыемстваў і гандляры, што забяспечвалі збыт прадукцыі. Прыватны сектар эканомікі не перасякаўся з дзяржаўным, што дазваляла ўсім прадпрыймальнікам пазбягаць кантролю савецкай улады за сваёй дзейнасцю.

Асноўнымі пакупнікамі прадукцыі прыватных прадпрыемстваў з’яўляліся сяляне, таму ў 1924 г. ў сялянскім бюджэце адбылося рэзкае павелічэнне расходаў на прамысловыя тавары. У сярэднім селянін траціў 67 % сваіх грошай на пакупку адзення, абутку, мануфактуры і земляробчага інвентару. Відавоч-

на, што аднаўленне тавараабмену паміж горадам і вёскай у БССР адбылося дзякуючы развіццю прыватнай вытворчасці.

У 1921 г. прыватная вытворчасць была на 70 % гарадской. У 1924 г. становішча кардынальна змянілася. Цяпер 65,6 % прыватных вытворчых прадпрыемстваў размяшчалася ў селькай мясцовасці, 20,5 % — у гарадах, 13,9 % — у мястэчках. У вёсках колькасць саматужнікаў, якія займаліся апрацоўкай дрэва, была ў 12 разоў вышэй, чым у гарадах. У сельскай мясцовасці наладжвалі сваю вытворчасць кавалі і слесары, мельнікі і алейшчыкі, бондары і смалакуры. Пераважна гарадскімі былі гарбарная і хімічная вытворчасць. Акруговым гарадам аддавалі перавагу мастакі, ювеліры, пераплётчыкі, уладальнікі красільняў, мылаварняў і друкарняў. У мястэчках пераважалі краўцы, шаўцы, шапачнікі, нарыхтоўшчыкі і сталяры [8, л. 18-19].

Самая высокая канцэнтрацыя прыватных прадпрыемстваў была ў мястэчках. Так саматужнымі або рамеснымі промысламі займаліся звыш 30 % жыхароў. У кожным мястэчку мелася свая асноўная галіна прыватнай вытворчасці. Так, у Крычаве, Бешанковічах і Ушачах галоўным быў ганчарны промысел, у Смілавічах і Уздзе — гарбарны, у Лядах, Жыткавічах і Капысі — сталярны. Перад зімовымі і вясновымі хрысціянскімі святамі местачковыя саматужнікі атрымоўвалі шмат заказаў ад сельскіх жыхароў, а перад асеннімі яўрэйскімі святамі — ад жыхароў мястэчка. Аднак ёмкасць рынка для местачковага саматужніка не абмяжоўвалася яго населеным пунктам і бліжэйшымі вёскамі. Пры наяўнасці попыту на яго прадукцыю ён нярэдка атрымоўваў заказы з іншых акруг. Так, прадукцыю гарбарняў Узды прыватныя гандляры прадавалі на ўсіх рынках Міншчыны і Магілёўшчыны і нават пастаўлялі за мяжу.

У акругах БССР так саманазіралася пэўная рэгіянальная спецыялізацыя прыватнай вытворчасці. Апрацоўка металаў была найбольш пашырана ў Аршанскай, Бабруйскай і Магілёўскай акругах. Дрэваапрацоўка пераважала ў Мінскай і Магілёўскай акругах. Смалакурэнне было распаўсюджана ў Мазырскай, Ар-

шанскай і Магілёўскай акругах. Мукамольна — алейнай вытворчасцю выдзяляліся Бабруйская, Мазырская і Магілёўскя акругі.

У цэлым па БССР найбольш рапаўсюджанымі промысламі былі: вытворчасць адзення і абутку — 40 %, металаапрацоўка — 19,8 %, дрэваапрацоўка — 18,5 %, гарбарная вытворчасць — 8,3 % і апрацоўка мінералаў — 2,9 % ад усіх прыватных прадпрыемстваў [9, л. 588]. Заможнымі прыватнымі вытворцамі лічыліся кушнеры, мылавары і мельнікі. Краўцы, шаўцы, кавалі, ганчары прадстаўлялі так званую «ніжэйшую групу па даходнасці». Самая дарагая сыравіна была ў гарбароў. Яна складала каля 82,64 % ад кошту гатовай прадукцыі.

У 1924-1926 гг. на дзесяць тысяч жыхароў Беларусі прыходзілася дзвесце прыватных вытворцаў. Па гэтаму паказчыку Беларусь пераўзыхозіла РСФСР і Украіну, дзе на тысячу жыхароў прыходзілася 172 прыватных прадпрыемства. Нацыянальны склад асоб, занятых прыватнай вытворчасцю, наступны: беларусаў мелася 45,5 %, яўрэяў 43,1 %, палякаў 1,7 %, рускіх 6,8 %, татар 1,8 %, украінцаў 0,8 %, латышоў 0,2 %.

На прамысловых і саматужных прадпрыемствах сустракалася пэўная механізацыя вытворчасці і мелася спецыяльнае абсталяванне. Механічнымі рухавікамі лічыліся лакамабілі на гарбарных заводах, паравыя катлы на лесапільнях і паравых млынах, жорны на ветраных і вадзяных млынах і г.д. У спецыяльнай анкеце прамысловец абавязкова ўказваў колькасць і вытворчую моц механічных рухавікоў. Спецыяльным абсталяваннем з'яўляліся бакі для закваскі цеста ў пякарнях, люстры, крэслы і ўмывальнікі ў цырульнях, шкляныя галерэі і асобныя пакоі для наведвальнікаў у фотаатэлье і г.д. У некаторых выпадках механізаваныя або спецыяльна абсталяваныя прадпрыемствы, нават пры адсутнасці наёмных рабочых і невялікай прыбытковасці, адносіліся да саматужных. Напрыклад, уладальнік крупадзёркі ў Клімавічах Е. Чорны працаваў на сваім прадпрыемстве аднаасобна, яго прыбытак за першае паўгоддзе 1924 г. склаў толькі трыста рублёў, што адпавядала даходу рамесніка. Аднак падатковы інспектар

прымусіў яго купіць патэнт для саматужнага прадпрыемства першага разраду [9, л. 33]. У цэлым механічнымі рухавікамі былі абсталяваны каля 7 % прыватных прадпрыемстваў.

У 1924 г. агульная колькасць прыватных вытворчых прадпрыемстваў павялічылася да 44 892 , што ў пяць разоў больш, чым было ў 1922 г. у БССР і ў далучаных да яе паветах. На іх працавала 73 % ўсіх рабочых, занятых у прамысловасці. У 1924 г. каля 18,5 % ад усіх прыватных вытворцаў адносіліся да рамеснікаў, 63,7 % — да саматужнікаў, 17,6 % — да прамыслоўцаў. Трэба адзначыць, што з 7 924 прамыслоўцаў 57 чалавек з'яўляліся ўладальнікамі цэнзавых прадпрыемстваў. Гэта значыць, што на кожным з такіх прадпрыемстваў мелася звыш 16 наёмных рабочых [10, л. 162] Пераважна гэта былі таварныя млыны, гарбарныя заводы і гільзавыя фабрыкі. Прыватная вытворчасць у гэты перыяд насіла пераважна саматужны характар.

Такім чынам, новая эканамічная палітыка дала больш свабоды прыватнай ініцыятыве ў прамысловасці і гандлі. На працягу 1921-1924 гг. адбываўся хуткі рост прыватных прадпрыемстваў, якія дамінавалі ў харчовай, гарбарнай, дрэваапрацоўчай і лёгкай прамысловасці. На прыватныя прадпрыемствы прыходзілася значная частка прамысловага абароту краіны.

### *Крыніцы*


1. НА РБ. — Фонд 63. — Воп. 1. — Спр. 176.
2. Там сама. — Спр. 834.
3. Там сама. — Фонд 93. — Воп. 1. — Спр. 475.
4. Там сама. — Фонд 30. — Воп. 1. — Спр. 1708 а.
5. Там сама. — Фонд 63. — Воп. 1. — Спр. 962.
6. Там сама. — Фонд 30. — Воп. 1. — Спр. 1295.
7. Там сама. — Спр. 204.
8. Там сама. — Спр. 105.
9. Там сама. — Воп. 2. — Спр. 823.
10. Там сама. — Воп. 1. — Спр. 888.